www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

1 верасня 2007 года, № 13 (1964)

# ВІВАТ, СТУДЭНТ!



**Дарагія першакурснікі!**

*Шчыра віншую вас з паступленнем у Беларускі дзяржаўны універсітэт! Думаю, што правільна будзе сказаць, – паколькі тут няма ніякага перабольшання, – кожнаму з вас пашанцавала стаць студэнтам вядучай ВНУ краіны. Упэўнены, што пашанцавала і БДУ, бо сюды прыйшлі юнакі і дзяўчаты, разумныя і таленавітыя, якія свядома абралі для далейшага навучання Беларускі дзяржаўны універсітэт.*

*Сапраўды, у сценах БДУ вас чакае шмат цікавага і новага, вы будзеце працаваць з выдатнымі выкладчыкамі, сустрэнеце новых сяброў. Спадзяюся, што вы скарыстаецеся вялікімі магчымасцямі, якія дае кожнаму студэнту Беларускі дзяржаўны універсітэт, і вашыя поспехі ў навуцы стануць значным унёскам у скарбонку славы і гонару БДУ і нашай краіны!*

*Вітаю вас, жадаю творчага плёну, моцнага здароўя і здзяйснення ўсіх мар і спадзяванняў!*

***Рэктар БДУ, прафесар Васіль СТРАЖАЎ***

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ Ў БДУ
Стар. 2

"ЗДАРОЎЕ ЗА ГРОШЫ НЕ КУПІШ"
Гутарка з загадчыкам кафедры фізвыхавання і спорту БДУ Віктарам КАЛЯДОЙ
Стар. 3

ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА
Стар. 4

## КЛЯТВА ПЕРШАКУРСНІКА

***Мы, першакурснікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, уступаючы ў шэрагі студэнцкага брацтва вядучай ВНУ краіны, урачыста клянемся:***

***прыняць эстафету годнага служэння айчыннай навуцы і культуры на карысць нашай дзяржаве;***

***не шкадуючы сіл, спасцігаць назапашаныя чалавецтвам веды;***

***высока несці, захоўваць і множыць слаўныя традыцыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, ва ўсім быць узорам сумленнасці, высакароднасці, працаздольнасці і дысцыпліны, актыўна ўдзельнічаць у грамадскім, навуковым і культурным жыцці роднай alma mater;***

***усю сілу розуму, увесь пал свайго сэрца накіраваць на павышэнне аўтарытэту айчыннай навукі і адукацыі;***

***з гонарам насіць гордае званне студэнта;***

***быць вартымі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь —***

***Клянемся!***
***Клянемся!***
***Клянемся!***



## СВЯТОЧНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ

**Сёння Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі адслужыць малебен у кафедральным Свята-Духавым саборы ў гонар новага навучальнага года ў Белдзяржуніверсітэце.**

**Святочная праграма "Віват, студэнт!" пачнецца ў 17.00 у Палацы спорту. Першакурснікаў павітаюць рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў і дэканы ўсіх факультэтаў. Пасля будзе канцэрт і дыскатэка.**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

РЭКТАР БДУ, старшыня Савета па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі краін – удзельніц СНД прафесар Васіль Стражаў ганараваны расійскай дзяржаўнай узнагародай – медалём Пушкіна. Гэтай пашаны ён удастоены Загадам Прэзідэнта РФ Уладзіміра Пуціна за вялікі ўнёсак у развіццё супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. Цырымонія адбылася 2 жніўня ў пасольстве Расійскай Федэрацыі ў Мінску. Узнагароду ўручыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў.

МІНІСТР замежных спраў Расійскай Федэрацыі Сяргей Лаўроў 28 чэрвеня выступіў перад студэнтамі і прафесарска-выкладчыцкім саставам Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сяргей Лаўроў прачытаў лекцыю на тэму "Актуальныя пытанні расійскай знешняй палітыкі". Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Расіі наведаў БДУ ў рамках афіцыйнага візіту ў нашу краіну з нагоды святкавання 15-годдзя дыпламатычных адносін Беларусі і Расіі.

РЭКТАР Ханойскага універсітэта навукі і тэхналогій Нгуэн Ван Мау, дарэчы, былы выпускнік БДУ, стаў госцем нашага універсітэта 25 жніўня. Ён азнаёміўся з шэрагам факультэтаў, сустрэўся з кіраўніцтвам ВНУ.

ІНТЭРНАТ № 1 БДУ прызнаны лепшым у сталіцы па выніках штогадовага агляду-конкурсу, які праводзіць Мінгарвыканкам.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## АКТУАЛЬНА

# ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ




Амаль 6 тыс. студэнтаў залічана сёлета ў БДУ. З іх на дзённую бюджэтную форму навучання – 1869, дзённую платную – 2452, завочную бюджэтную – 345, завочную платную – 1093, замежных грамадзян – 201.

Як паведамлялася раней, у гэтым годзе конкурс абітурыентаў на дзённую бюджэтную форму навучання значна вырас і склаў у цэлым па ВНУ 3, 21 чалавекі на месца (у 2006 г. – 2, 56). Высокім атрымаўся конкурс і на дзённую платную форму навучання – 1, 62 чалавекі на месца.

На дзённую бюджэтную форму самы высокі конкурс сярод прыродазнаўчых спецыяльнасцяў склаў 5 чалавек на месца на спецыяльнасці "Геаэкалогія". А сярод факультэтаў прыродазнаўчага профілю самы высокі конкурс – болей за 4 чалавекі на месца – быў зафіксаваны на біялагічным факультэце. На геаграфічным факультэце ён склаў 2, 37 чалавекі; на факультэце радыёфізікі і электронікі – 2, 1; на фізічным факультэце, факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, хімічным факультэце – 1, 7.

Самы высокі конкурс у БДУ зафіксаваны на гуманітарным факультэце на спецыяльнасці "Дызайн" (напрамак – камунікатыўны дызайн) – 14, 8, а на спецыяльнасці "Псіхалогія" гэтага ж факультэта конкурс склаў 13 чалавек на месца. Стабільна высокім застаецца конкурс на папулярныя сярод абітурыентаў спецыяльнасці факультэта міжнародных адносін: "Міжнародныя адносіны" – 10, 2, "Міжнароднае права" – 11.

На дзённай платнай форме навучання самы высокі конкурс – 3, 2 чалавекі – на спецыяльнасці "Радыёфізіка".

Сярэдні бал атэстата абітурыентаў склаў 8, 22.

Профільныя іспыты ва універсітэце, у тым ліку і творчыя конкурсы, здавалі 3989 абітурыентаў.

Сярэдні бал атэстата залічаных на I курс на дзённай бюджэтнай форме навучання склаў 8, 71, пры гэтым практычна 40 % маюць сярэдні бал атэстата вышэй за 9, 0.

У лік студэнтаў залічана 132 пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд і 2 лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў. Сярод іх 7 пераможцаў міжнародных алімпіяд школьнікаў па матэматыцы і фізіцы, якім на паседжанні прыёмнай камісіі 3 жніўня былі ўручаны студэнцкія білеты факультэтаў прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, радыёфізікі і электронікі, фізічнага факультэта.

Сярод залічаных на I курс 12, 4 % – выпускнікі сельскіх школ (у 2006 г. – 11, 5 %), 38, 3 % – выпускнікі ліцэяў і гімназій (у 2006 г. – 34, 4 %).

Па мэтавым прыёме залічана 12 абітурыентаў, у тым ліку 9 – для раённых газет Чарнобыльскай зоны. У сувязі з высокім прахадным балам у сельскіх абітурыентаў па кожнай трэцяй спецыяльнасці праводзіўся аб'яднаны конкурс.

Мінчан залічана крыху болей за 36 %.

Сярод залічаных замежных грамадзян, як і ў пазамінулыя гады, высокі працэнт складаюць грамадзяне Кітая – 68 %.

Сярод спецыяльнасцяў, дзе залічэнне адбывалася толькі па сертыфікатах цэнтралізаванага тэсціравання, самы высокі прахадны бал зафіксаваны на спецыяльнасці "Сусветная эканоміка" – 363 (у 2006 г. – 357). Наступнымі ў гэтым спісе ідуць: "Лінгвакраіназнаўства" – 360 для гарадскога конкурсу (у 2006 г. – 343), "Міжнародныя адносіны" – 356 (у 2006 г. – 333), "Мэнэджмэнт у сферы міжнароднага турызму" – 355 (у 2006 г. – 327).

Сярод прыродазнаўчых спецыяльнасцяў самыя высокія прахадныя балы на спецыяльнасці "Кампутарная бяспека" факультэта радыёфізікі і электронікі: для сельскіх абітурыентаў ён склаў 33, 1, а для гарадскіх – 34; на спецыяльнасці "Кампутарная бяспека" факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі – 32, 8.

Для атрымання другой вышэйшай адукацыі, у першую чаргу па эканамічных і праваназнаўчых спецыяльнасцях, залічана 386 чалавек.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

# ПАЦВЕРДЗІЛІ ТРАДЫЦЫЮ

***Залаты, тры срэбных і два бронзавых медалі заваявала каманда Беларускага дзяржаўнага універсітэта на XIV Міжнароднай алімпіядзе па матэматыцы сярод студэнтаў універсітэтаў (IMC).***

Яна прайшла ў балгарскім горадзе Благоеўградзе з 3 па 9 жніўня. "Золата" зарабіў студэнт факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Руслан Максімаў, "срэбра" атрымалі студэнты гэтага ж факультэта Павел Іржаўскі і Аляксандр Мядзведзеў, а таксама студэнт механіка-матэматычнага факультэта Іван Блізнец. Другакурснікі механіка-матэматычнага факультэта Аляксандр Бондар і Уладзімір Ягораў заслужылі "бронзу".

У гэтай алімпіядзе прынялі ўдзел звыш за 100 універсітэтаў з болей чым 30-ці краін свету, у тым ліку Расіі, Украіны, ЗША, краін Заходняй і Усходняй Еўропы, Ірана, Бразіліі, Калумбіі, Інданезіі і г. д.

Каманда БДУ прымала ўдзел у падобных спаборніцтвах у сёмы раз, прычым заўсёды вярталася з медалямі, заваяваўшы ў агульным з 2001 года 26 залатых, 18 срэбных і 5 бронзавых медалёў.

# СТУДБІЛЕТ ЗА ПОСПЕХ НА АЛІМПІЯДЗЕ

**Беларускія школьнікі заваявалі залаты, срэбны і 4 бронзавых медалі на 48-й Міжнароднай матэматычнай алімпіядзе ў Ханоі (В'етнам), якая праходзіла з 19 па 31 ліпеня з удзелам каманд з 93-х краін свету.**

Асобна трэба адзначыць выхаванцаў сталічнай школы № 41, якую звязвае з факультэтам прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ ужо дзесяцігадовае супрацоўніцтва. Сёлетнія выпускнікі гэтай школы Арцём Міцкевіч і Яўген Жыбрык заваявалі на алімпіядзе адпаведна "золата" і "срэбра". Іх аднакласнік Вадзім Слюсараў разам з выпускніком лідскай гімназіі № 1 Станіславам Шапавалавым, а таксама вучнем 10-га класа Дзянісам Пірштуком і дзесяцікласніцай Святланай Аўчыннікавай з віцебскай гімназіі № 37 атрымалі "бронзу". Усе яны і склалі беларускую каманду на спаборніцтвах у Ханоі.

**Вылучыліся нашы школьнікі таксама і на Міжнароднай алімпіядзе па фізіцы, якая прайшла у Тэгеране (Іран).**

Сярод пераможцаў – ліцэісты БДУ Максім Севелеў, які атрымаў залаты медаль, Аляксандр Глымбоцкі (срэбны медаль), Павел Гулевіч (бронзавы медаль). Уладальнікамі "бронзы" сталі таксама выпускнік сталічнай СШ № 51 Андрэй Маліноўскі і выпускнік баранавіцкай гімназіі № 5 Віталь Ляўчук.

Ушанаванне прызёраў адбылося 3 жніўня ў БДУ на паседжанні прыёмнай камісіі. У мерапрыемстве ўдзельнічалі рэктар Белдзяржуніверсітэта прафесар Васіль Стражаў, старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Уладзімір Шчэрба, дэканы факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і фізічнага факультэта Павел Мандрык і Віктар Анішчык.



Пры гэтым, Арцём Міцкевіч, Яўген Жыбрык, Вадзім Слюсараў, Станіслаў Шапавалаў, Віталь Ляўчук і Андрэй Маліноўскі *(на фотаздымку)* ўрачыста атрымалі студэнцкія білеты і заліковыя кніжкі студэнтаў Белдзяржуніверсітэта. Падобная цырымонія прайшла ў БДУ упершыню.

**Падрыхтавала Настасся ЮДЧЫЦ**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

## УШАНАВАННЕ

# ГАНАРАВАННЕ МІНІСТРА З ПАР

***У Беларускім дзяржаўным універсітэце 6 ліпеня адбылося ўрачыстае паседжанне Вучонага савета з нагоды ўручэння дыплома аб прысваенні звання "Ганаровы прафесар БДУ" міністру замежных спраў Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Нкасазанэ Дламіні-Зума.***

Нкасазанэ Дламіні-Зума стала другім чалавекам, ганараваным гэтым званнем у БДУ. Упершыню яно было прысуджана сёлета 1 лютага Генеральнаму дырэктару Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці Каміла Ідрысу.

Нкасазанэ Дламіні-Зума – першая жанчына ў гісторыі ПАР, якая стала міністрам замежных спраў. Адзначаецца, што пад яе кіраўніцтвам знешнепалітычнае ведамства гэтай краіны праводзіць актыўную палітыку, якая адрозніваецца маштабнасцю, паслядоўнасцю і прагматызмам. Такі падыход вылучыў ПАР на ролю рэгіянальнага лідэра, без якога не абыходзіцца вырашэнне асноўных праблем Афрыкі. Міністр Дламіні-Зума вядомая паважанымі і сяброўскімі адносінамі да Беларусі. Яна прымае асабісты ўдзел ва ўмацаванні міждзяржаўных адносін паміж нашай краінай і Паўднёвай Афрыкай. Мае прэміі і ўзнагароды Сусветнай арганізацыі аховы здароўя; Яўрэйскай жаночай арганізацыі; Міжнароднага жаночага форуму (IWF) "Жанчынам, якія пераўтвараюць свет"; Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі "Паўднёва-афрыканская дэкада перамоганоснага кіраўніцтва" (прысуджаецца выбітным чарнаскурым бізнэсмэнам і дзяржаўным дзеячам); Афрыканскага Саюза па распрацоўку і рэалізацыю плана "Новае партнёрства для развіцця Афрыкі".



*Нкасазана Дламіні-Зума атрымоўвае ганаровы дыплом з рук прарэктара БДУ па вучэбнай рабоце Уладзіміра Клюні*

Нкасазанэ Дламіні-Зума 11 ліпеня мінулага года была ўзнагароджана расійскім Ордэнам Пятра Вялікага I ступені. Яна стала другім дзяржаўным дзеячам пасля Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна, ганараваным гэтай узнагародай.

**Дзмітрый ЖАРЫН**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

## НАША СПАДЧЫНА

# ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ Ў БДУ

***Беларускі дзяржаўны універсітэт 29 чэрвеня ўшанаваў памяць студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ, якія геройчна змагаліся падчас Вялікай Айчыннай вайны і паклалі сваё жыццё за вызваленне і незалежнасць Беларусі.***

Дзень памяці ў БДУ пачаўся ўрачыстым мітынгам ля стэлы ў гонар загінуўшых студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў, дзе выступіў рэктар прафесар Васіль Стражаў, прадстаўнікі Савета ветэранаў БДУ і Мінскага гарадскога савета БГА ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў. Ушанаваць памяць ахвяр Вялікай Айчыннай вайны прыйшлі ветэраны, сённяшнія студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі Белдзяржуніверсітэта. Удзельнікі мітынгу ўсклалі кветкі да помніка ва ўніверсітэцкім скверыку. Тут жа адбылося ўзнагароджанне студэнтаў – пераможцаў віктарыны, прысвечанай Дню Перамогі, якая ладзілася ў БДУ ў маі. Затым усе прысутныя пазнаёміліся з літаратурнай экспазіцыяй, аб'яднанай агульнай тэмай вайны.

Па заканчэнні мерапрыемства для ветэранаў, моладзі і пераможцаў віктарыны была арганізавана паездка на Лінію Сталіна.

У жыцці alma mater Дзень памяці – знамянальная дата, якая традыцыйна адзначаецца 29 чэрвеня. Адпаведнае рашэнне было прынятае Вучоным саветам БДУ ў 2005 годзе ў памяць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, якая трагічна адгукнулася не толькі ў лёсе мільёнаў савецкіх людзей, але і ў гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Нагадаем, што менавіта ў гэты дзень 66 гадоў назад планавалася ўрачыстае паседжанне Вучонага савета, прымеркаванае да дваццацігоддзя ВНУ, але правядзенню юбілейных мерапрыемстваў перашкодзіла вайна.

**Лейла ІСМАІЛАВА**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

*Віктар КАЛЯДА:*

# "ЗДАРОЎЕ ЗА ГРОШЫ НЕ КУПІШ"



***У Белдзяржуніверсітэце заўжды шмат увагі надаецца стану здароўя студэнтаў. У першую чаргу гэтым займаецца кафедра фізвыхавання і спорту БДУ. Гутарку з яе загадчыкам, доктарам навук, заслужаным трэнерам Беларусі, майстрам спорту па барацьбе, прафесарам Віктарам КАЛЯДОЙ мы і прапануем вашай увазе.***

**– Віктар Антонавіч, цяжка ўзначальваць такую стратэгічна важную структуру?**

– Сапраўды, няпроста *(усміхаецца)*. У мяне вельмі шырокі дыяпазон дзейнасці: даводзіцца набываць спартыўны інвентар, падбіраць кваліфікаваныя кадры, арганізоўваць медыцынскі кантроль навучэнцаў, дбаць пра ўмелае спалучэнне фізічнай культуры студэнта з яго прафесійнай дзейнасцю, вучобай, клапаціцца пра ідэалогію спорту...

**– Як Вы ацэньваеце матэрыяльную базу па развіцці фізічнай культуры ў БДУ?**

– У апошні час тут адбыліся сур'ёзныя зрухі. Пасля капітальнага рамонту быў уведзены ў эксплуатацыю спартыўны комплекс "Універсітэцкі" на вул. Кастрычніцкай. У ім дзейнічаюць некалькі спартыўных залаў для розных відаў спорту, 25-метровы басейн, а таксама аздараўленчы блок з парылкаю, утульнымі распранальнямі і душавымі. За дзень спарткомплекс можа прыняць да 1, 5 тыс. чалавек. Неўзабаве скончыцца рэканструкцыя стадыёна з футбольным полем, якое будзе мець спецыяльнае штучнае пакрыццё.

Акрамя таго, плануецца будаўніцтва манежу (паветраапорнага збудавання), на тэрыторыі філіяла БДУ ў Шчомысліцах. Ён будзе выкарыстоўвацца для забеспячэння вучэбнага працэсу тых факультэтаў, якія базуюцца ў Шчомысліцах: гуманітарны, біялагічны, а таксама радыёфізікі і электронікі.

Яшчэ – летась на біялагічным факультэце было вылучана два пакоі ў цокальным памяшканні для размяшчэння лыжнай базы.

Будоўля і адкрыццё названых аб'ектаў неабходныя. Болей за 3 тыс. студэнтаў змогуць наведваць гэтыя комплексы.

**– Ці адбываецца рост спартыўных дасягненняў вашых падапечных?**

– У БДУ функцыянуе каля 25-ці спартыўных секцый. Нашы спартсмены паказваюць неблагія вынікі як на рэспубліканскім, так і на міжнародным узроўнях. Напрыклад, жаночая каманда па футболе "Зорка БДУ" стала срэбраным прызёрам чэмпіянату краіны ў 2005 г. У гэтым годзе студэнткі Алена Саннікава і Вольга Васілёнак заваявалі золата ў лыжнай эстафеце ў складзе нацыянальнай зборнай на Сусветнай зімовай універсіядзе ў Турыне. Каманда БДУ паспяхова выступае на штогадовых рэспубліканскіх універсіядах. Найболей развітыя ў нас віды спорту – грэка-рымская барацьба, гіравы спорт, лёгкая атлетыка, крос, лыжы, веласпорт, плаванне, спартыўнае арыентаванне і каратэ.

**– Як выглядае агульная сітуацыя са здароўем сучасных студэнтаў?**

– Студэнты сталі часцей хварэць – гэта найвастрэйшая праблема ў краіне. Сёння болей за 2 тыс. нашых студэнтаў вызваленыя ад заняткаў па фізвыхаванні, каля траціны лічацца ў спецыяльных групах лячэбнай фізкультуры. Для змянення сітуацыі мы выкарыстоўваем два падыходы. Першы – традыцыйныя сродкі паляпшэння здароўя навучэнцаў – у асноўным цыклічныя і гульнявыя віды спорту: плаванне, хадзьба на лыжах, бег, веласпорт, валейбол, паскораная хадзьба. Другі – нетрадыцыйныя сродкі, да якіх адносяцца розныя віды аэробікі (памп-аэробіка, слайд-аэробіка, стэп-аэробіка), фітнэс, шэйпінг. Да таго ж, вялікай папулярнасцю карыстаюцца ўсходнія танцы, адзінаборствы і розныя ўсходнія сістэмы аздараўлення. Для ажыццяўлення фізпадрыхтоўкі на высокім сучасным узроўні мы праводзім тэсціраванне фізічнага функцыянальнага стану нашых студэнтаў. Гэта дазваляе распрацаваць адэкватную сістэму падачы фізічнай нагрузкі, якая адпавядае індывідуальным паказчыкам здароўя студэнта. Здароўе за грошы не купіш. Таму нашы выкладчыкі прыкладаюць усе намаганні, каб студэнты гарманічна развіваліся і ніколі не хварэлі.

**– Якія задачы стаяць першымі ў чарзе тых, што вырашае кафедра фізвыхавання і спорту?**

– Перш-наперш – канчатковае забеспячэнне спартыўным інвентаром, павелічэнне медыцынскага персаналу і ўзмацненне кадравага патэнцыялу. Я максіміліст і намагаюся зрабіць кафедру найлепшай у рэспубліцы. Для гэтага трэба мець ідэальна адладжаны навучальны працэс, сістэмнасць у падрыхтоўцы спартсменаў, рэгулярна выпускаць навуковую прадукцыю з грыфам Міністэрства адукацыі. Зараз мы выдаем два зборнікі – "Здаровы лад жыцця" і "Пытанні фізічнай адукацыі". Я ганаруся, што ў нас працуюць дзесяць заслужаных трэнераў Беларусі, каля пяцідзесяці майстроў спорту і майстроў спорту міжнароднага класу, уключаючы алімпійскага чэмпіёна Сеула Камандара Маджыдава. Гэта вялікая пашана для ўсяго БДУ, і мы будзем усяляк умацоўваць заваяваныя пазіцыі.

**Яўген ПЕШЧУР**

**Фота Кацярыны ШАТАВО**

# БДУ ў СМІ Беларусі

**Ход прыёмнай кампаніі ў БДУ і яе вынікі сталі асноўнымі тэмамі, якія цікавілі журналістаў летам у дачыненні да нашага універсітэта. Пра гэта пісалі і паведамлялі:**

БелТА (22.06; 18.07; 30.07; 05.08; 10.08; 12.08), БелаПАН (13.07), tut.by (23.06; 12.07; 13.07; 20.07; 27.07; 30.07; 13.08), naviny.by (13.07; 30.07; 13.08; 17.08), "Комсомольская правда в Белоруссии" (13.07; 01.08; 07.08), "Минский курьер" (18.07; 24.07; 03.08; 07.08; 09.08), "Рэспубліка" (19.07; 24.07; 31.07; 07.08; 14.08), "Звязда" (20.07; 31.07; 07.08; 14.08; 18.08), "Вечерний Минск" (24.07; 30.07; 31.07; 07.08; 14.08), "Народная газета" (31.07; 02.08; 07.08; 14.08), "Настаўніцкая газета" (02.08), "Труд" (02.08), "Экспресс-новости" (02.08), "Знамя юности" (03.08), "7 дней" (16.08).

Таксама ў СМІ Беларусі былі размешчаны матэрыялы на наступныя тэмы.

**Баль выпускнікоў БДУ** – БелТА (19.06), БелаПАН (19.06), "Вечерний Минск" (25.06).

**Зборы па падрыхтоўцы школьнікаў да ўдзелу ў міжнародных алімпіядах па фізіцы, матэматыцы, хіміі і біялогіі на базе БДУ** – "Настаўніцкая газета" (21.06).

**Ушанаванне ў БДУ пераможцаў 13-й алімпіяды па беларускай мове, якая праходзіць у Польшчы** – "Звязда" (22.06; 03.08).

**Студэнт IV курса ФПМІ Максім Осіпаў як кіраўнік адной з кампаній у Парку высокіх тэхналогій у Мінску** – "СБ–Беларусь сегодня" (22.06).

**Пра спевака Георгія Калдуна ў якасці выхавацеля ў "Брыганціне"** – БелТА (22.06), naviny.by (22.06).

**Работа Летняга багаслоўскага інстытута, арганізаванага Інстытутам тэалогіі БДУ і Маскоўскім Біблейска-багаслоўскім інстытутам Св. апостала Андрэя** – БелТА (22.06), "Звязда" (29.06), "Вечерний Минск" (29.06), "Знамя юности" (20.07).

**Перамога студэнтаў ФПМІ на спаборніцтвах па спартыўным праграмаванні TopCoder** – часопіс "Беларусь" (06.2007).

**Патрыятычна-асветніцкая акцыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Вязынцы ў гонар 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа** – "Наша Ніва" (26.06); "Минская правда" (23.06, 07.07).

**Інтэрв'ю з прарэктарам па вучэбнай рабоце Віктарам Самахвалам з нагоды Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Кіраванне якасцю вышэйшай адукацыі ва ўмовах пераходу да двухступеньчатай сістэмы падрыхтоўкі кадраў", якая прайшла ў БДУ** – "Настаўніцкая газета" (23.06).

**Студатрады БДУ** – "Вечерний Минск" (26.06), "БелГазета" (02.07), "Минский курьер" (11.07), "Звязда" (20.07), "Знамя юности" (03.08).

**Лекцыя міністра замежных спраў Расіі Сяргея Лаўрова ў БДУ** – агенцтва "РИА-Новости" (28.06), БелТА (28.06), Интерфакс (28.06), БДГ on-line (29.06).

**Урачыстае паседжанне Вучонага савета БДУ з нагоды ўручэння дыплома ганаровага прафесара БДУ міністру замежных спраў ПАР Нкасазанэ Дламіні-Зума** – БелТА (06.07), tut.by (06.07), naviny.by (06.07), "Рэспубліка" (07.07).

**"Срэбра" каманды БДУ на Другой адкрытай міжнароднай студэнцкай алімпіядзе па праграмаванні KPI-OPEN** – БелТА (10.07), БелаПАН (11.07), naviny.by (10.07, "Вечерний Минск" (11.07), "Знамя юности" (20.07).

**Ферамонныя прэпараты па ахове лесу ад насякомых-шкоднікаў** – БелТА (16.07), "Рэспубліка" (19.07), "Звязда" (19.07), "Народная газета" (20.07), "Наша Ніва" (23.07).

**Інтэрв'ю з доктарам філалагічных навук, загадчыкам кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання журфаку БДУ прафесарам Віктарам Іўчанкавым пра закон аб беларускім правапісе** – "Настаўніцкая газета" (17.07).

**Летняя рэспубліканская фізіка-матэматычная навукова-даследчая школа, арганізаваная Мінадукацыі РБ, Мінгарвыканкамамі і БДУ** – "Настаўніцкая газета" (17.07), "Минский курьер" (18.07), БелТА (25.07; 28.07), "Знамя юности" (10.08).

**Перамогі выхаванцаў выкладчыкаў БДУ на міжнародных прадметных алімпіядах школьнікаў** – БелТА (24.07; 26.07), "Настаўніцкая газета" (26.07; 28.07; 31.07), "Звязда" (03.08), tut.by (06.08).

**Археалагічныя знаходкі студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ ў Белавежскай пушчы** – "Народная газета" (25.07), "Зара" (Брэст, 26.07), "Рэспубліка" (14.08).

**Міжнародная школа-семінар па актуальных праблемах фізікі, арганізаваная пад Гомелем пры ўдзеле фізікаў БДУ** – "Гомельские ведомости" (28.07).

**Праблемы айчыннай прыватызацыі каментуе дэкан эканамічнага факультэта БДУ Міхаіл Кавалёў** – "Звязда" (28.07).

**Інтэрв'ю з пераможцам праграмы "Умники и умницы" выпускніком Ліцэя БДУ Яўгенам Мядзведзевым** – "Минский курьер" (31.07).

**Уручэнне студэнцкіх білетаў БДУ пераможцам міжнародных алімпіяд** – БелТА (01.08), "Народная газета" (02.08; 11.08), БелаПАН (02.08), naviny.by (02.08), "Рэспубліка" (02.08), "Минский курьер" (04.08), "Звязда" (04.08), "Вечерний Минск" (06.08), "Настаўніцкая газета" (07.08), "СБ–Беларусь сегодня" (07.08), "Знамя юности" (10.08).

**Узнагароджанне рэктара БДУ Васіля Стражава расійскім медалём Пушкіна** – БелТА (02.08), tut.by (02.08), "Народная газета" (09.08), "Зара" (04.08).

**Уступная кампанія ў Юрыдычны каледж БДУ** – БелТА (07.08), naviny.by (07.08), "Вечерний Минск" (08.08), "Звязда" (08.08).

**Каментарый дэкана эканамічнага факультэта БДУ Міхаіла Кавалёва да расійска-беларускіх адносін у рамках Саюза Беларусі і Расіі** – "СБ–Беларусь сегодня" (09.08).

**Інтэрв'ю з доктарам фізіка-матэматычных навук загадчыкам лабараторыі НДІ ядзерных праблем БДУ Сяргеем Максіменка пра развіццё нанатэхналогій** – "Народная газета" (09.08).

**Перамога інтэрната № 1 БДУ ў конкурсе інтэрнатаў ВНУ г. Мінска** – БелТА (10.08), "Настаўніцкая газета" (14.08), "Рэспубліка" (14.08).

**Інтэрв'ю з загадчыкам лабараторыі псіхафізіялогіі і прафесіяграфіі Рэспубліканскага цэнтра праблем чалавека БДУ Святланай Сагайдак** – "Народная газета" (11.08).

**Перамога студэнтаў ФПМІ БДУ на Міжнароднай алімпіядзе па матэматыцы ў Балгарыі** – БелТА (13.08), БелаПАН (13.08), naviny.by (13.08), "Вечерний Минск" (15.08), "Звязда" (17.08), "Настаўніцкая газета" (18.08).

**Засяленне ў інтэрнаты БДУ** – БелТА (15.08), naviny.by (17.08), "Минский курьер" (17.08), "Звязда" (17.08).

**Падрыхтоўка да наступнай прыёмнай кампаніі** – "Народная газета" (22.08).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# ЗАСЯЛЕННЕ

***Інтэрнаты БДУ гатовыя да засялення, якое адбываецца па графіку з 25 жніўня. Месцамі будуць забяспечаны каля 60 % іншагародніх студэнтаў, якія маюць патрэбу ў жыллі, а гэта болей за 5,5 тыс. чалавек.***

Штогод у інтэрнатах БДУ ладзяцца рознага кшталту рамонты, якія дазваляюць працягнуць тэрмін эксплуатацыі будынкаў і зрабіць пражыванне ў іх бяспечным, камфортным і ўтульным. Акрамя падрадных арганізацый, у добраўпарадкаванні інтэрнатаў традыцыйна ўдзельнічаюць і студэнты. Сёлета такі студэнцкі будатрад налічваў 144 чалавекі.

На жаль, у новым навучальным годзе з 10-ці будуць функцыянаваць толькі 9 інтэрнатаў БДУ. У верасні закрываецца на капітальны рамонт інтэрнат № 7. Але ўжо са студзеня 2008 года пачнецца ўзвядзенне новага будынка на 1030 месцаў у студэнцкай вёсцы на праспекце Дзяржынскага.

Каб дапамагчы студэнтам вырашыць жыллёвае пытанне, па ініцыятыве Студэнцкага гарадка створаны электронны банк даных пра кватэры і пакоі, якія здаюцца ў наём для студэнтаў БДУ. Гэтая інфармацыя размешчана на сайце www.bsu.by ў раздзеле "Студэнты" і даступная ў рэжыме on-line. Акрамя таго, для аператыўнага рэагавання на пытанні, што тычацца засялення, у Студэнцкім гарадку з 23 жніўня па 5 верасня з 8.30 да 18.00 будзе працаваць "Гарачая тэлефонная лінія" (тэл. 209-52-99).

**Паводле інфармацыі Студгарадка**

# АЗДАРАЎЛЕННЕ

***Студэнцкі санаторый-прафілакторый Беларускага дзяржаўнага універсітэта аб'яўляе графік заездаў на дзённы стацыянар для аздараўлення ў другім паўгоддзі 2007 года:***

1) з 05.09 па 25.09.2007 г.;
2) з 11.09 па 01.10.2007 г.;
3) з 02.10 па 22.10.2007 г.;
4) з 23. 10 па 13.11.2007 г.;
5) з 15.11 па 05.12.2007 г.;
6) з 06. 12 па 27.12.2007 г.

Студэнцкі санаторый-прафілакторый размешчаны ў зялёнай прыгараднай зоне (пас. Шчомысліца) і цалкам займае 2-гі паверх студэнцкага інтэрната № 3.

Да цэнтра горада (Галоўны вучэбны корпус БДУ) можна даехаць гарадскім аўтобусам – маршрут № 47.

У гэтым жа раёне знаходзіцца прыродны запаведнік рэспубліканскага значэння "Дуброва", які валодае высокім рэкрэацыйным патэнцыялам, выконвае важныя санітарна-гігіенічныя функцыі і з'яўляецца крыніцай гаючага паветра ў ваколіцах.

Студэнты, што знаходзяцца тут на аздараўленні, забяспечваюцца трохразовым харчаваннем у сталовых БДУ. Сума талонаў на харчаванне ў 5 разоў перавышае кошт пуцёўкі.

Для атрымання пуцёўкі ў санаторый-прафілакторый неабходна падаць:

1) заяву на імя старшыні камісіі па аздараўленні з указаннем тэрміну заезду, падпісаную намеснікам дэкана факультэта;

2) медыцынскую даведку для атрымання пуцёўкі ў санаторна-курортную ўстанову (выпісвае тэрапеўт па месцы жыхарства – форма 070 у-02).

Кошт пуцёўкі з 01.01.2007 г. складае 23 тыс. рублёў.

**Наш адрас: прасп. Незалежнасці, 4, каб. 204, упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю; тэл. 209-52-75. Працуем з 9.00 да 17.15.**

**Паводле інфармацыі ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю**

# ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

***Учарашнія школьнікі сталі студэнтамі. Іншае жыццё, іншыя правілы. Каб вы не згубіліся ў плыні новай інфармацыі, прапануем вам у дапамогу своеасаблівы компас па універсітэце і яго структурах — “Школу першакурсніка”. З пытаннямі, якія вас цікавяць, звяртайцеся ў рэдакцыю газеты, і мы будзем рады вам дапамагчы.***

## СТАНЬ ЛІДАРАМ

***Падчас навучання ў БДУ маладыя людзі становяцца не толькі спецыялістамі ў абранай сферы: яны вучацца быць актыўнымі грамадзянамі сваёй краіны.***

**Студэнцкі саюз БДУ** падтрымлівае ініцыятывы, накіраваныя на развіццё студэнцкага самакіравання, міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва, валанцёрскай дзейнасці.

**Пярвічная арганізацыя грамадскага аб'яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”** (з правамі раённага камітэта) падтрымлівае ініцыятывы, скіраваныя на выхаванне патрыятызму, пераемнасці пакаленняў, узаемадзейнічае з Саветам ветэранаў БДУ, спрыяе другаснай занятасці студэнтаў.

**Савет старастаў БДУ** інфармуе студэнтаў пра падзеі ў навуковым, грамадскім, спартыўным і культурным жыцці універсітэта, абмяркоўвае з кіраўніцтвам БДУ праблемы, якія ўзнікаюць у студэнтаў падчас навучання.

**Савет па матэрыяльным стымуляванні і аказанні матэрыяльнай дапамогі студэнтам і аспірантам БДУ** прымае рашэнні пра ўстанаўленне надбавак і размеркаванне матэрыяльнай дапамогі студэнтам і аспірантам універсітэта.

**Студэнцкі савет па якасці адукацыі БДУ** спрыяе павышэнню якасці адукацыі ў БДУ, адлюстроўвае пазіцыю студэнтаў да дзейнасці універсітэта ў гэтай сферы, робіць прапановы па арганізацыі навучальнага працэсу.

**Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў** абараняе прафесійныя, працоўныя, сацыяльна-эканамічныя правы і законныя інтарэсы сваіх членаў **(прасп. Незалежнасці, 4, галоўны корпус БДУ, каб. 203, тэл. 206-62-33).**

**По больш падрабязную інфармацыю звяртайцеся ва ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю: прасп. Незалежнасці, 4, галоўны корпус, каб. 205, 207, тэл. 209-50-59, 209-52-61**

## ШУКАЕМ ТАЛЕНТЫ

**Народная харавая капэла.** Заняткі адбываюцца па панядзелках, сярэдах, пятніцах у 19.30 у аўд. 433 галоўнага корпуса БДУ.

**Народны фальклорны ансамбль “Тутэйшая шляхта ”.** Заняткі адбываюцца па аўторках і чацвяргах з 17.00 да 19.00 у актавай зале філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31).

**Народны аркестр народных інструментаў.** Заняткі ладзяцца па панядзелках і сярэдах у 19.30 у аўд. 607 галоўнага корпуса БДУ.

**Клуб аўтарскай песні.** Заняткі праводзяцца па аўторках у 18.00 у аўд. 605 хімічнага факультэта.

**Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль “Неруш”.** Заняткі ладзяцца па аўторках і чацвяргах у 19.00 у галоўным корпусе БДУ.

**Народны ансамбль танца “Крыжачок”.** Заняткі адбываюцца па панядзелках, сярэдах і чацвяргах у 19.30 у спартыўнай зале галоўнага корпуса БДУ.

**Народны музычны тэатр-студыя БДУ “На філфаку”.** Заняткі ладзяцца па панядзелках, сярэдах, чацвяргах у 19.00 у актавай зале філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31).

**Народны тэатр-студыя “На балконе”.** Заняткі адбываюцца з аўторка па пятніцу ў 18.00 на 5-м паверсе галоўнага корпуса БДУ.

Акрамя таго, дзейнічаюць студыя эстраднай песні, вакальны ансамбль “Галант”, хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў “Родніца”, узорны дзіцячы ансамбль танца “Літарынка”, каманда КВЗ БДУ.

**Вас чакаюць ва ўпраўленні па справах культуры БДУ: прасп. Незалежнасці, 4, каб. 211, тэл. 209-54-69**

## ДАПАМОЖА ПСІХАЛАГІЧНАЯ СЛУЖБА

У кожнага з нас бываюць перыяды, калі мы губляем упэўненасць, адчуваем непрыемныя перажыванні, стрэс. Не ладзяцца адносіны са сваякамі і блізкімі, узнікаюць праблемы ў кантактах з іншымі людзьмі. І не хапае ўласных сілаў, псуецца настрой, з'яўляецца адчуванне, што “разладзіўся механізм” і страчана жыццёвая раўнавага. Многія праходзяць праз гэта і працягваюць паўнацэнна жыць і працаваць. Пытанне толькі ў тым, колькі часу мы страцілі, колькі згубілі магчымасцяў, якія варыянты так і не змаглі рэалізаваць.

Нам неабходная дапамога іншых — тых, хто можа даць вартую параду. Такую дапамогу мы можам атрымаць, напрыклад, ад бацькоў, сяброў, старэйшых таварышаў. І вельмі часта гэтага дастаткова.

А калі няма магчымасці падзяліцца праблемай са знаёмымі людзьмі? Калі яны недаступныя ў патрэбны момант? Для гэтага існуюць спецыялісты-псіхолагі. Іх прафесійная дзейнасць грунтуецца на прынцыпах даверу, канфідэнцыйнасці, ананімнасці. Галоўная задача псіхолага — дапамагчы чалавеку самому справіцца з праблемай, выявіць і задзейнічаць уласны патэнцыял.

У Белдзяржуніверсітэце ўжо доўгі час працуе Псіхалагічная служба. Яе спецыялісты (а гэта дыпламаваныя педагогі-псіхолагі) ладзяць псіхалагічныя кансультацыі. Кожны з іх курыруе пэўны факультэт. І ў вас ёсць магчымасць звярнуцца да спецыяліста, які лепей ведае спецыфіку вашага факультэта, але вы таксама можаце звярнуцца і да любога іншага псіхолага — паверце, вам не адмовяць, а добразычліва і з разуменнем выслухаюць і дапамогуць.

Акрамя аказання псіхалагічнай дапамогі, спецыялісты ладзяць шмат іншых мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю псіхалагічнай інфармацыі, развіццё тых ці іншых навыкаў. Вы можаце наведаць:

— сацыяльна-псіхалагічныя трэнінгі па кантактах, развіцці дзелавых якасцяў, пашырэнні творчага патэнцыялу, мастацтве кіраваць часам, эфектыўным планаванні ды інш.;

— студэнцкі псіхалагічны клуб, дзе можна атрымаць інфармацыю па псіхалогіі, пагаварыць з аднадумцамі і цікавымі людзьмі і нават крыху адчуць сябе псіхолагам;

— клуб ролевых гульняў “Брама вымярэнняў”, дзе вы можаце кантактаваць у рэжыме ролевай гульні, з карысцю бавіць час, пазнаёміцца з новымі людзьмі;

— студэнцкую псіхалагічную бібліятэку, дзе спецыялісты падбяруць патрэбную вам літаратуру.

**Прыходзьце, мы чакаем вас: вул. Кастрычніцкая, 4, каб. 105, тэл. 206-60-37.**

**Руслан ПАПОК, кіраўнік Псіхалагічнай службы БДУ**

## ПАХОД У БІБЛІЯТЭКУ

***Бібліятэка падчас навучання становіцца неад'емным памочнікам студэнтаў. Тут можна знайсці адказы амаль на ўсе пытанні. Каб праца ў бібліятэцы была эфектыўнай, варта ведаць, як гэты храм ведаў функцыянуе і якія паслугі прапануе.***

Студэнты кожнага факультэта БДУ адносяцца да аднаго з 8-мі абанементаў, дзе маюць права браць літаратуру з фонду бібліятэкі дамоў. Таксама яны могуць наведваць любую з 16-ці чытальных залаў, размешчаных амаль на кожным факультэце. Акрамя традыцыйных выданняў, у бібліятэцы ёсць доступ да паўнатэкставых і бібліяграфічных баз даных з навуковай і адукацыйнай інфармацыяй у чытальнай зале электронных інфармацыйных рэсурсаў па адрасе: прасп. Незалежнасці, 4, каб. 210.

Фундаментальная бібліятэка БДУ аказвае як традыцыйныя, так і дадатковыя паслугі. Сярод бясплатных – атрыманне неабходнай інфармацыі пра фонды бібліятэкі, карыстанне картакавымі і электронным каталогамі, картатэкамі, базамі даных, выдача ў часовае карыстанне ў чытальных залах і на абанементах друкаваных выданняў, навучанне студэнтаў пошуку інфармацыі ў базах даных, арганізацыя разнастайных выставаў, прэзентацый і інш.

З 2004 г. у бібліятэцы ўведзены платныя паслугі. Яны накіраваныя, з аднаго боку, на спрашчэнне працы студэнта ў бібліятэцы, з другога – на збор сродкаў для далейшага папаўнення фондаў. Гэта – выдача кніг з чытальных залаў на ноч або на 1 гадзіну; працягванне тэрміну карыстання ўзятай дамоў літаратуры, калі на яе няма попыту з боку іншых чытачоў; тэматычныя падборкі літаратуры бібліятэкарам па запыце студэнта; афармленне і рэдагаванне бібліяграфічных спісаў да навуковых, дыпломных, курсавых і іншых прац; ксеракапіраванне, сканіраванне і перфапераплёт дакументаў і г.д. Праз службу электроннай дастаўкі дакументаў чытачы могуць замовіць электронныя копіі артыкулаў, адсутных у фондзе бібліятэкі.

ФБ БДУ займаецца таксама платнай перадачай спісаных з яе фондаў выданняў. У будынку філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31) у каб. 124 у буднія дні з 11-ці да 16-ці гадзін дзейнічае выстава-продаж мастацкай, філасофскай, філалагічнай, гістарычнай літаратуры і кніг на замежных мовах.

**Па дадатковую інфармацыю можна звяртацца на сайт ФБ БДУ www.library.bsu.by ці па тэлефонах 209-50-82 і 209-50-33.**



## ВІРТУАЛЬНЫ ВЫХАД У СВЕТ

Афіцыйны сайт БДУ — **www.bsu.by**. У сетцы БДУ існуе таксама ўнутраны агульнауніверсітэцкі сайт (**http: // intranet.bsu**), на якім службы універсітэта публікуюць аператыўную інфармацыю і дакументы, неабходныя ў тым ліку і студэнтам. У прыватнасці, на сайце ёсць інфармацыя пра медыятэкі. Медыятэкі — агульнауніверсітэцкія кампутарныя класы, прызначаныя для самастойнай работы студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і супрацоўнікаў універсітэта. У структуры Цэнтра інфармацыйных тэхналогій створаныя тры агульнауніверсітэцкія медыятэкі:

**№ 1 — у корпусе геаграфічнага факультэта (вул. Ленінградская, 16, аўд. 114);**

**№ 2 — у корпусе факультэта радыёфізікі і электронікі (вул. Курчатава, 5, аўд. 211);**

**№ 3 — у корпусе БДУ па вул. Рэвалюцыйнай, 11 (аўд. 203).**

Медыятэкі інтэграваныя ў карпаратыўную сетку БДУ, г.зн. у іх даступныя ўсе рэсурсы сеткі БДУ: навучальныя матэрыялы факультэтаў, сістэма e-University, бібліятэчныя рэсурсы і Інтэрнэт. Кожны кампутар аснашчаны навушнікамі, мікрафонам, прыладай чытання DVD-дыскаў і USB-портамі. Палова кампутараў мае прылады запісу на дыскі CD і DVD, USB-кошыкі для работы з уласнымі хард-дыскамі, прылады для чытання картаў памяці. У кожнай медыятэцы ўсталяваны шматфункцыянальны сеткавы апарат (прынтэр, сканэр, капір).



Працаваць можна ў любой з медыятэк. Абавязковая ўмова — наяўнасць імя карыстальніка (Login), зарэгістраванага ў сетцы БДУ. Для студэнтаў імя карыстальніка ўказана на пластыкавым студэнцкім білеце. На сайце http:// intranet.bsu ў раздзеле “Выхад у Інтэрнэт для студэнтаў” апісваюцца тэхналогіі выкарыстання імёнаў карыстальнікаў і пароляў для студэнтаў у карпаратыўнай сетцы БДУ. Пры рэгістрацыі імені карыстальніка для студэнтаў пароль не задаецца. Студэнт самастойна павінен прызначыць пароль праз раздзел “Выхад у Інтэрнэт для студэнтаў”, прычым зрабіць гэта трэба адразу пасля атрымання білета, каб гэтым імем не карысталіся іншыя.

**Медыятэкі працуюць у дзве змены (да 21.00), а таксама ў суботу (да 19.00).**

**Больш падрабязны графік працы і іншую неабходную інфармацыю пра медыятэкі і карпаратыўную сетку БДУ чытайце на сайце INTRANET.BSU**

**Фота Аляксандра СНАПКА**

## “ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ” ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

У БДУ дзейнічае “Студэнцкая гарачая лінія” (тэл. **209-54-16**). Яна створана для своечасовага рэагавання на канкрэтныя факты, кваліфікаванае вырашэнне студэнцкіх пытанняў і прапаноў па ўдасканальванні навучальна-выхаваўчага працэсу і іншых аспектаў дзейнасці ВНУ.

Акрамя таго, свае заўвагі, звароты і пытанні студэнты могуць адрасаваць рэктару універсітэта, апусціўшы ліст у скрыні “Пытанні рэктару”, якія стаяць у кожным навучальным корпусе.

## З УСМЕШКАЙ

Абітурыент здае экзамен па гісторыі. Як заўсёды – нічога не ведае.

– Ну хоць бы пра пачатак другой сусветнай вайны распавядзіце.

– Навокал ноч, дым і танкі, танкі...

***

Два грузіны паступаюць у інстытут. На сумоўі ў аднаго з іх пытаюцца:

– Вы замежную мову ведаеце?
– Не.
– А Ваш брат Гіві?
– Так.
– Што "так"?
– Таксама не.

***

Заява дэкану: "Прашу налічыць мне стыпендыю ў сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам, выкліканым адсутнасцю стыпендыі".

***

– Гэй! Рукі за галаву, ногі на шырыні плеч!
– Гэта абрабаванне?!
– Не – урок фізвыхавання!

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

1 верасня 2007 года
Падпісана да друку 29.08.2007 г.
Зак. 787. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП “Выдавецкі цэнтр БДУ”
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, каб. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by